# ЭКАНОМІЦЫ ПАТРЭБНЫ ПРАФЕСІЯНАЛЫ

## ПРЭСТЫЖ І ПЕРСПЕКТЫВА

— Пачатак новага навучальнага года — гэта заўсёды новыя надзеі, — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да навучэнцаў каледжа. — Гэта новыя магчымасці, новыя адкрыцці. Асабліва важны сённяшні дзень для першакурснікаў. Наперадзе ў вас яркі, цікавы і разам з тым вельмі адказны перыяд. Вы ўжо зрабілі свой першы сур'ёзны крок у жыцці — выбралі прафесію — сапраўдную прафесію, рабочую.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: галоўны рэсурс любога прадпрыемства — не абсталяванне, якім бы сучасным і высокатэхналагічным яно ні было, а людзі. Рабочы-прафесіянал ніколі не застанецца без справы. Ён будзе запатрабаваны заўсёды, і попыт на такіх спецыялістаў пастаянна расце.

— Усё больш маладых людзей усведамляюць, што прафесійная адукацыя — гэта прэстыжна і, самае галоўнае, вельмі перспектыўна, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Штогод больш за трэць выпускнікоў школ выбіраюць ліцэі і каледжы ў якасці першай ступені прафесійнага кар'ернага росту. Сёлета на педагагічным савеце мы прынялі рашэнне аб тым, што і пры паступленні ў ВНУ мы будзем аддаваць прыярытэт тым, хто паспрабаваў, што называецца, на зуб будучую прафесію, хто ў ліцэях і каледжах зрабіў свае першыя крокі.

— Адукацыя павінна арыентавацца на патрэбнасці эканомікі, — заявіў Прэзідэнт. — Трэба рыхтаваць тых спецыялістаў, якія сёння запатрабаваны ў нашым жыцці. Дасягнуць поспеху ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі наша краіна зможа, толькі сканцэнтраваўшы ўвесь інтэлектуальны рэсурс на стварэнні высокатэхналагічных, навукаёмістых прадпрыемстваў і інавацыйных галін.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах кіраўніка краіны, жыццёва неабходна забяспечыць кваліфікаванымі работнікамі такія сферы, як будаўніцтва, перапрацоўчая прамысловасць, машынабудаўніцтва:

— Прычым нам патрэбны не проста «рабочыя рукі», а майстры сваёй справы, якія сваімі рукамі будуць ствараць дэталі, вузлы, механізмы — словам, канкурэнтаздольныя тавары заўтрашняга дня.

Прэзідэнт расказаў навучэнцам каледжа, што нядаўна яму паказалі новы камбайн «Палессе».

— Добрая тэхніка, нічым не саступае імпартным аналагам, — канстатаваў ён. — Але нам патрэбна, каб яна не проста не саступала, а пераўзыходзіла тэхніку канкурэнтаў. Ідэі і напрацоўкі ў нашых канструктараў ёсць, але, каб яны набылі рэальныя абрысы, патрэбны адукаваныя рабочыя, людзі, адданыя сваёй справе.

У падрыхтоўцы такіх кадраў вядучая роля адводзіцца прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

— Мы разглядаем яе як школу фарміравання прафесіянала, грамадзяніна, патрыёта, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Бо рабочы чалавек, як ніхто іншы, цэніць дасягненні свайго калектыву, прадпрыемства, сваёй краіны, цэніць мір і дабрабыт.

Звяртаючыся да выкладчыкаў, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што іх задача заключаецца не толькі ў падрыхтоўцы спецыялістаў, але і ў выхаванні гарманічнай асобы.

## ПРАКТЫКУМ ПА ЭЛЕКТРАКАРАХ

У каледжы, дарэчы, ёсць лабараторыя дыягностыкі, дзе навучэнцы вывучаюць электрамабілі розных марак — іх спецыфіку, будову. Літаральна днямі тэме развіцця электратранспарту ў краіне — у прыватнасці, электрамабіляў — была прысвечана рабочая сустрэча кіраўніка дзяржавы. Безумоўна, учора яму было асабліва цікава паглядзець, з чым працуюць будучыя канструктары айчынных электракараў. Прэзідэнт прызнаўся, што для яго галоўнае ў такім аўтамабілі — надзейнасць, бяспека і даўгавечнасць. Даручэнне Аляксандра Лукашэнкі: да запуску БелАЭС у краіне павінны быць і спажыўцы такога тавару, як айчынны электракар, і — абавязкова — інфраструктура.

Падчас наведання навучальнай установы кіраўнік дзяржавы заслухаў даклад пра стан сістэмы прафесійнай адукацыі ў Беларусі. Так, зараз у нас ідзе яе аптымізацыя. Атрымаць сярэднюю спецыяльную, прафесійна-тэхнічную адукацыю можна ў каледжах, каледжах пры ВНУ, прафесійных ліцэях. Плануецца зрабіць адзіны тып установы ў гэтай сістэме — каледж. Аляксандр Лукашэнка падтрымаў такую прапанову.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ДЗЕНЬ ВЕДАЎ — СВЯТА ДЛЯ ЎСІХ

### Прадстаўнікі ўлады наведалі 1 верасня школы і каледж

**Спікеры абедзвюх палат беларускага парламента наведалі ўстановы адукацыі і зрабілі падарункі навучэнцам.**

Так, **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** пабываў у Мінскім дзяржаўным каледжы электронікі. Такі выбар быў зроблены нездарма. Па яго словах, запатрабаваную прафесію ў нашай краіне можна атрымаць не толькі па заканчэнні ВНУ. «У нашай эканоміцы запатрабаваныя, я сказаў бы, у вялікіх маштабах высокакваліфікаваныя кадры з прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Гэта фактычна тыя ж інжынеры, тыя ж спецыялісты, вельмі блізкія па ўзроўні ведаў да ўніверсітэцкага», — лічыць сенатар.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента мяркуе, што яшчэ нямала трэба папрацаваць для таго, каб дапамагчы маладому чалавеку, які заканчвае школу, вызначыцца, дзе яму вучыцца, дзе яму працаваць. «Часам я бачу, што мы недапрацоўваем у гэтым плане. І на слыху модныя прафесіі — праграміст, юрыст, эканаміст, дызайнер», — кажа парламентарый. Пры гэтым у Беларусі вельмі запатрабаваныя, напрыклад, інжынерныя кадры, якія потым працуюць над стварэннем прадукцыі, здольнай канкурыраваць на сусветных рынках.

Міхаіл Мясніковіч ад імя верхняй палаты беларускага парламента перадаў каледжу грашовы сертыфікат, сродкі якога плануецца накіраваць на набыццё абсталявання для камп'ютарнага класа.

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу**, прыняў удзел у святочнай лінейцы ў сярэдняй школе №2 горада Докшыцы Віцебскай вобласці. Спікер адзначыў, што адукацыя — гэта прыярытэт дзяржаўнай палітыкі Беларусі. «Мы разумеем, што ад стану адукацыі залежыць эканоміка краіны, дабрабыт нашых грамадзян, стабільнасць у грамадстве і бяспека ў дзяржаве. Таму пытанням адукацыі ўдзяляецца вялікая ўвага», — сказаў ён.

Дэпутат таксама адзначыў, што па пытаннях удасканалення адукацыі дэпутатамі ўжо шмат зроблена. «Прынята вялікая колькасць заканадаўчых актаў, якія датычацца развіцця адукацыі. У 2010 годзе мы ўжо кадыфікавалі ўсе гэтыя законы і стварылі вельмі салідны дакумент — Кодэкс аб адукацыі. Такога дакумента няма ні ў адной краіны на постсавецкай прасторы», — канстатаваў спікер. Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што цяпер ідзе актыўная работа над новай рэдакцыяй Кодэкса аб адукацыі.

У падарунак ад дэпутатаў Нацыянальнага сходу школа атрымала тэлевізар.

**Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ** узяў удзел у святочнай лінейцы ў Ліноўскай сярэдняй школе Пружанскага раёна. «Адна з галоўных задач, якія ставіць кіраўніцтва краіны, заключаецца ў тым, каб кожны школьнік, дзе б ён ні вучыўся, ні жыў, меў аднолькавы доступ да якаснай адукацыі. Каб кожны вучань меў роўныя з іншымі магчымасці па атрыманні адукацыі, а ўзровень яго падрыхтоўкі ні ў якой меры не залежаў ад маёмаснага становішча, месца жыхарства і іншых фактараў. Кожны чалавек павінен развіць свае здольнасці, а мы — забяспечыць яму такую магчымасць», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

На памяць пра наведванне ўстановы адукацыі кіраўніком урада ёй застануцца два новыя тэлевізары.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*




# НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ЎЗЯЛІСЯ ЗА КУКУРУЗУ

**Беларускім аграрыям засталося ўбраць 4,4% пасяўных плошчаў. Згодна з аператыўнай інфармацыяй Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання на 1 верасня з палёў краіны ўбрана 7425,8 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур. Сярэдняя ўраджайнасць склала 35,7 ц/га.**

Паводле інфармацыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама, у вобласці пачалі масавую ўборку кукурузы на сілас. Гэтым займаюцца сельгасарганізацыі ўсіх раёнаў. Да 1 верасня яна ўбраная з 27 тысяч га, або з 11,1% пасяўных плошчаў. Усяго аграрыі нарыхтавалі больш за 660 тысяч тон зялёнай масы пры сярэдняй ураджайнасці 244 ц/га. Сёлета пасевы кукурузы на зялёную масу ў рэгіёне былі пашыраны на 10 тысяч га і зараз складаюць 244,2 тысячы. Пры гэтым спецыялісты скарацілі плошчы ўгоддзяў пад сенажаць і ворыва, прадукцыйнасць якіх ва ўмовах засушлівага надвор'я ў апошнія гады была нізкай.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

## ■ Блізкая ўлада

# На высокім узроўні

**Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае на планавай аснове ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах. На наступным тыдні яны адбудуцца ў Брэсцкай, Віцебскай і Гродзенскай абласцях і Мінску, паведамляе БЕЛТА.**

Так, галоўны саветнік упраўлення пісьмовых і электронных зваротаў галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта МЕЛЯШКЕВІЧ Алена Аляксандраўна прыме грамадзян 5 верасня ў Смаргонскім райвыканкаме з 10.00 да 13.00.

6 верасня памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці ГЕРАСІМАЎ Васіль Мікалаевіч правядзе асабісты прыём грамадзян у Высокаўскім гарвыканкаме з 10.00 да 13.00.

У гэты ж дзень памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці РАЎНЕЙКА Сяргей Васілевіч прыме грамадзян у Зэльвенскім райвыканкаме з 10.00 да 13.00.

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па г. Мінску КАРПЯК Уладзімір Валянцінавіч правядзе прыём грамадзян 6 верасня з 13.00 да 16.00 у адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска.

6 верасня начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення ІЛЬЯСЕВІЧ Аляксандр Іосіфавіч правядзе сумесны прыём грамадзян са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама ЛІСАМ Анатолем Васілевічам у Маларыцкім райвыканкаме з 10.00 да 13.00.

8 верасня галоўны саветнік упраўлення ідэалогіі і інфармацыйнай палітыкі галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення МАРЧАНКА Наталля Міхайлаўна прыме грамадзян у Браслаўскім райвыканкаме з 10.00 да 13.00.

Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў і па тэлефоне адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы (200-63-96).

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## У Кеніі адмянілі вынікі прэзідэнцкіх выбараў

Вярхоўны суд Кеніі ўпершыню ў гісторыі краіны ануляваў вынікі прэзідэнцкіх выбараў. Суд спаслаўся на парушэнні пры іх правядзенні і пастанавіў, што новыя выбары трэба правесці на працягу 60 дзён. У мінулым месяцы выбарчая камісія абвясціла пераможцам выбараў Ухуру Кеніята, для якога гэта быў бы ўжо другі тэрмін прэзідэнцтва. Кандыдат ад апазіцыі Раіла Адзінга сцвярджаў, што інтэрнэт-сістэма выбарчай камісіі была ўзламаная, каб паўплываць на вынікі выбараў.



## Ураган «Ірма» ўзмацніўся да небяспечнай катэгорыі

Ураган «Ірма» ў Атлантычным акіяне ўзмацніўся да небяспечнай 3-й катэгорыі з пяці і накіроўваецца да Карыбскага басейна, паведаміў Нацыянальны цэнтр па папярэджанні ўраганаў ЗША (NHC). Ураган знаходзіцца за 1,1 тысячы кіламетраў на захад ад архіпелага Каба-Вердэ і працягвае рухацца на захад. Хуткасць ветру ўнутры ўрагану складае да 185 кіламетраў за гадзіну, удакладніў NHC. У наступныя дні ўраган будзе прасоўвацца ў напрамку Пуэрта-Рыка і Гаіці, якіх ён можа дасягнуць да сярэдзіны наступнага тыдня.

## Колькасць ахвяр сутыкненняў у М'янме перавысіла 400 чалавек

Колькасць ахвяр сутыкненняў паміж урадавымі сіламі і прадстаўнікамі мусульманскай этнічнай меншасці на захадзе М'янмы за тыдзень дасягнула 402 чалавек, паведамляе Reuters са спасылкай на даныя японскага агенцтва Kyodo. Каля 40 тысяч мусульман-рахінджа ўцяклі ў Бангладэш і на нейтральныя тэрыторыі. Дзясяткі бежанцаў загінулі, у джунглях гараць падпаленыя вёскі. Як вядома, узброены канфлікт у пераважна будыйскай краіне абвастрыўся 25 жніўня. Прадстаўнікі «Арміі выратавання Аркан рахінджа» пачалі арганізаваную атаку на паліцэйскія пасты і вайсковыя базы, адрэагаваўшы такім чынам на пераследаванні прадстаўнікоў этнічнай меншасці.

## У Сонечнай сістэме з'явіцца другое Сонца

Навукоўцы місіі Gaia вызначылі тэрміны наступлення на Зямлі астэроідна-каметнага калапсу, калі ў гравітацыйныя межы Сонечнай сістэмы ўвойдзе аранжавы карлік Gliese 710. Пра гэта паведамляе Еўрапейскае касмічнае агенцтва. Згодна з разлікамі прыкладна праз 1,3 мільёна гадоў Gliese 710 апынецца на адлегласці каля 16 тысяч астранамічных адзінак ад Сонца. Гэта прывядзе да гравітацыйнага адхілення арбіт нябесных цел з воблака Аорта, частка з іх пачне міграваць углыб Сонечнай сістэмы, дзе знаходзіцца Зямля.

